СУЧАСНАЯ БЕЛАРУСКАЯ ЛЕКСІКАГРАФІЯ

ІДЫЁМНЫЯ І ЭЛЕКТРОННЫЯ СЛОЎНІКІ

Заканчэнне. Пачатак у №№ 1, 3, 6, 8.

УДК 811.161.3

II. Ідыёмныя слоўнікі – клас лексікаграфічных прац, у якіх асноўным аб'ектам апісання выступаюць падзельна афармленыя моўныя адзінкі і сінтаксічныя канструкцыі.

1. Слоўнікі фразеалагізмаў – тып семантычных ідыёмных слоўнікаў, дзе сістэматызуюцца фразеалагізмы – устойлівыя, узнаўляльныя моўныя адзінкі, якія спалучаюцца са словамі свабоднага ўжывання і маюць цэласнае значэнне, не роўнае суме значэнняў іх кампанентаў.

Гісторыя беларускай фразеаграфіі ідзе ад XIX ст., калі ўстойлівыя выразы пачалі сістэматызавацца і тлумачыцца ў працах Я. Ляцкага, І. Насовіча, Е. Раманава, А. Рыпіньскага, Я. Чачота, П. Шпілеўскага [6, с. 214 – 215].

Існуюць тлумачальныя і перакладныя фразеалагічныя слоўнікі. Тлумачальныя слоўнікі могуць уключаць як матэрыял літаратурнай мовы, так і фразеалагізмы, пашыраныя ў народных гаворках.

Вяршыня беларускай фразеаграфіі – працы І. Лепешава: "Фразеалагічны слоўнік беларускай мовы" (у 2 т.; Мінск, 1993; каля 6 тыс. сл. арт.) і "Слоўнік фразеалагізмаў беларускай мовы" (у 2 т.; Мінск, 2008; каля 7 тыс. сл. арт.).

У гэтых слоўніках фразеалагізмы маюць трохбаковую характарыстыку – семантычную, граматычную і стылістычную. У іх уключаны выразы актыўнага фразеалагічнага фонду, якія па сферы ўжывання адносяцца да агульнамоўных. Пададзены асобныя выразы пасіўнага складу з паметамі *устар.* і *абл.*

Мікраструктура слоўніка складаецца з наступных інфармацыйных зон: 1) зона намінацыі, 2) зона граматычнай інфармацыі, 3) зона стылістычнай інфармацыі, 4) зона функцыянальнай інфармацыі, 5) зона семантычнай інфармацыі, 6) зона ілюстрацый, 7) зона пашпартызацыі.

ГУЛЯЙ • **ГУЛЯЙ-ВЕ́ЦЕР**(1). *Мн. не ўжыв. Вык. ці азн.*(2) *Разм. Неадабр.*(3) Ужыв. пры дзейн. са знач. асобы.(4) Легкадумны, пусты чалавек; ветрагон.(5) **Сін.**: узвей-вецер.(4) – *А цікава было б пабачыць гэта, – задзіркавата падхапіў ліслівы гуляй-вецер Юзік.* Мурашка. *Ды ён [Сінёў] і не такі гуляй-вецер, як ты…* Масарэнка.(7) *Аскольд казаў, што я па натуры гуляй-вецер і што ўсіх у семнаццаць [гадоў] некуды цягне…* Марчук(7).

У "Этымалагічным слоўніку фразеалагізмаў" І. Лепешава (Мінск, 2004; каля 1750 сл. арт.) тлумачыцца сэнс і раскрываецца паходжанне фразеалагізмаў беларускай мовы.

Слоўнікавы артыкул складаецца з наступных інфармацыйных зон: 1) зона намінацыі, 2) зона этымалагічнай інфармацыі, 3) зона семантычнай інфармацыі, 4) зона ілюстрацый, 5) зона пашпартызацыі.

Турусы на калёсах.(1) *Відаць, недакладная паўкалька з італ. м.* (turres ambulatoriae, літаральна "турусы рухомыя, якія ходзяць").(2) Бязглуздзіца, балбатня, небыліцы.(3) [*Голас з грамады:*] *Разводзь, разводзь, даўгавалосы, турусы на калёсах!*(4) (Я. Колас. На шляхах волі).(5)

Турусамі ў старажытнасці называлі вялікія перасовачныя вежы для асады крэпасцей. Многія не верылі ў існаванне такіх асадных машын і гаворку пра іх успрымалі як лухту. Выраз фіксуецца ў "Зборніку беларускіх прыказак" І. І. Насовіча: *гоніць турусы на калёсах* 'гаворыць бязглуздзіцу'(2).

Для школьнікаў прызначаны "Фразеалагічны слоўнік" Н. Гаўрош, І. Лепешава, Ф. Янкоўскага (Мінск, 1973; 1339 сл. арт.).

Устойлівыя выразы, выкарыстаныя асобнымі класікамі беларускай літаратуры, сістэматызаваны ў "Фразеалагічным слоўніку мовы твораў Якуба Коласа" пад рэдакцыяй А. Аксамітава (Мінск, 1993; больш за 6 тыс. сл. арт.) і "Слоўніку фразеалагізмаў мовы твораў Янкі Купалы" В. Ляшчынскай і З. Шведавай (Гомель, 2007; каля 2 тыс. сл. арт.).

Дыялектная фразеалогія пададзена ў слоўніках: "Слоўнік беларускай народнай фразеалогіі" Е. Мяцельскай і Я. Камароўскага (Мінск, 1972; 2015 сл. арт.), "З народнай фразеалогіі: дыферэнцыяльны слоўнік" І. Лепешава (Мінск, 1991; каля 700 сл. арт.), "Слоўнік дыялектнай фразеалогіі Гродзеншчыны" М. Даніловіча (Гродна, 2000; 2167 сл. арт.), "Рубельскі лексіка-фразеалагічны слоўнік" М. Пашкевіча (Брэст, 2008; 200 фразеалагізмаў), "Фразеалагічны

*Цыкл матэрыялаў "Тэорыя і гісторыя беларускай лексікаграфіі" **Дзмітрыя Дзятко** друкуецца з 2016 г. У №№ 7 – 8 змешчаны артыкул "Лексікаграфія як раздзел мовазнаўства: Тэрміны, праблемы, тыпы слоўнікаў", у №№ 3, 4, 6, 7 за 2017 г. – артыкул "Перыядызацыя гісторыі беларускай лексікаграфіі: XIII – пачатак XX ст.".*

слоўнік Косаўшчыны" А. Зайкі (Брэст, 2014; каля 2,5 тыс. сл. арт.); у выданнях Г. Юрчанкі (у трох слоўніках серыі 4425 сл. арт.): "І коціцца і валіцца" (Мінск, 1972), "І сячэ і паліць" (Мінск, 1974), "Слова за слова" (Мінск, 1977) і інш.

У перакладных фразеалагічных слоўніках прыводзяцца нацыянальныя ўстойлівыя выразы і іх адпаведнікі ў іншых мовах. Да такіх выданняў адносяцца: "Англа-беларускі слоўнік фразеалагізмаў параўнальнага тыпу" Л. Корсак і Л. Марціновіч (Мінск, 1984; 348 сл. арт.), "Słownik frazeologiczny białorusko-polski" А. Аксамітава і М. Чурак (Варшава, 2000; 1877 сл. арт.), "Малы руска-беларускі слоўнік прыказак, прымавак і фразем" З. Санько (Мінск, 1991; 871 фразеалагізм), "Руска-беларускі фразеалагічны слоўнік: для сярэдняй школы" І. Кісялёва (Мінск, 1991; каля 800 сл. арт.), "Кароткі лацінска-руска-беларускі слоўнік юрыдычнай фразеалогіі" Н. Ганчаровай і М. Антанюк (Мінск, 2000; каля 1,3 тыс. сл. арт.), "Англа-беларускі слоўнік саматычных фразеалагізмаў; Беларуска-англійскі слоўнік саматычных фразеалагізмаў" Л. Кулік і В. Ляшчынскай (Гомель, 2010; 586 сл. арт.), "Слоўнік фразеалагізмаў з кампанентамі-заонімамі: на матэрыяле беларускай і нямецкай моў" С. Мілач (Брэст, 2010; 139 сл. арт. у беларускай частцы), "Беларуска-англійскі ідэаграфічны слоўнік фразеалагізмаў з прасторавай семантыкай" В. Арцёмавай (Мінск, 2013; 2-е выд. 2014; каля 550 сл. арт.).

2. Слоўнікі парэмій – тып семантычных ідыёмных слоўнікаў, дзе апісваюцца (тлумачацца, перакладаюцца) прыказкі – кароткія вобразныя выразы, якія характарызуюцца рытмічнай арганізацыяй і ўжываюцца ў мове па прынцыпе аналогіі.

Гісторыя беларускай парэміяграфіі пачынаецца прыкладна з сярэдзіны XIX ст. Беларускія прыказкі (побач з фразеалагізмамі) пададзены ў "Сборнике белорусских пословиц" І. Насовіча (СПб., 1874; 3715 сл. арт.) і працы "Люд беларускі на Русі Літоўскай" М. Федароўскага (Варшава, т. 4, 1935; 13 231 сл. арт.).

Існуюць тлумачальныя і перакладныя парэміялагічныя слоўнікі. Да тлумачальных адносяцца "Крынічнае слова" І. Шкрабы і Р. Шкрабы (Мінск, 1987; каля 750 сл. арт.), "Слоўнік беларускіх прыказак" І. Лепешава і М. Якалцэвіч (Мінск, 1996; 3-е выд., дап. 2006; 1629 сл. арт.), "Слоўнік беларускіх прыказак, прымавак і крылатых выразаў" С. Івановай і Я. Іванова (Мінск, 1997; 141 сл. арт.), "Прыказкі і прымаўкі: тлумачальны слоўнік беларускіх прыказак і прымавак з архіўных, кафедральных збораў, рэдкіх выданняў XIX і XX стст." А. Аксамітава (Мінск, 2000; 2-е выд., дапр., 2002; каля 3,5 тыс. сл. арт.).

Найбольш поўны сучасны парэміялагічны слоўнік – "Тлумачальны слоўнік прыказак" І. Лепешава і М. Якалцэвіч (Гродна, 2011; каля 1800 сл. арт.), дзе апісаны афарызмы народнага паходжання. Слоўнік створаны на аснове картатэкі, сабранай шляхам франтальнага і выбарачнага распісвання мастацкай і публіцыстычнай літаратуры галоўным чынам XX ст. (выкарыстаны творы амаль 400 аўтараў). Пры распрацоўцы мікраструктуры аўтары імкнуліся ўлічваць сінанімічныя сувязі паміж прыказкамі.

Да перакладных парэміялагічных слоўнікаў належаць: "Малы руска-беларускі слоўнік прыказак, прымавак і фразем" З. Санько (Мінск, 1991; 478 прыказак), "Беларуска-нямецкі парэміялагічны слоўнік" Я. Іванова і Н. Раманавай (Магілёў, 2006; каля 500 прыказак на беларускай мове і больш за 800 прыказак на нямецкай), "Русско-белорусский паремиологический словарь" Я. Іванова і В. Макіенкі (Магілёў, 2007; каля 300 сл. арт.), "Польска-беларускі парэміялагічны слоўнік" Я. Іванова і С. Івановай (Магілёў, 2007; 200 сл. арт.), "Англа-беларускі парэміялагічны слоўнік" пад рэдакцыяй Я. Іванова (Магілёў, 2009; каля 300 сл. арт.) і інш.

3. Слоўнікі параўнанняў – тып функцыянальных ідыёмных слоўнікаў, што змяшчаюць фігуры, пабудаваныя на падабенстве двух прадметаў, у якіх праяўляецца агульная прымета.

Беларускія параўнанні зафіксаваны ў невялікім выданні Ф. Янкоўскага "Беларускія народныя параўнанні: кароткі слоўнік" (Мінск, 1973). У сучасным "Слоўніку беларускіх народных параўнанняў" Т. Валодзінай і Л. Салавей (Мінск, 2011; больш за 8 тыс. сл. арт.) змяшчаюцца параўнальныя выразы рознага тыпу, выбраныя з дыялектных слоўнікаў, фальклорных зборнікаў і іншых крыніц. У слоўнікавым артыкуле пазначаецца зона пашырэння таго або іншага параўнання, даецца стылістычная характарыстыка, тлумачыцца значэнне, указваецца крыніца інфармацыі:

лантýх	**разрабіцца як лантýх**. *Віл. Няўхв.* Пра тоўстага і непаваротлівага чалавека. СПЗБ 2, 617. < Лантух – мех.
прыіца	**ліпнуць як прыца.** *Мсцісл.* Пра прыліпанне нечага глейкага. Юрчанка, 194.

"Слоўнік параўнанняў у мове мастацкіх твораў Янкі Купалы" В. Ляшчынскай і З. Шведавай (Гомель, 2004; больш за 800 сл. арт.) сістэматызуе параўнанні, якія выбраны з мастацкіх твораў Янкі Купалы і адлюстроўваюць асацыятыўнае поле паэта.

4. Слоўнікі перыфраз – тып функцыянальных ідыёмных слоўнікаў, дзе адлюстраваны семантычна непадзельныя, іншасказальныя выразы, якія выступаюць апісальнай перадачай зместу іншых слоў або іх спалучэнняў.

У выданне "Беларуская перыфраза (кароткі слоўнік)" Г. Малажай (Мінск, 1974; 692 сл. арт.)

уключаны і індывідуальна-аўтарскія, і традыцыйныя апісальныя выразы. Асноўнай крыніцай матэрыялу для слоўніка стала мова мастацкай літаратуры і публіцыстычных выданняў. Кожнай перыфразе прысвечаны невялікі артыкул, у якім тлумачыцца значэнне апісальнага выразу, даецца стылістычная характарыстыка (*грэбл.* – з адценнем грэблівасці, *узнёсл.* – з адценнем узнёсласці і інш.), запісваецца ілюстрацыйны прыклад. У дужках падаюцца варыянтныя формы кампанентаў перыфразы.

Крылатыя малацьбіты. *Жартаўл.* Птушкі.

Крылатыя малацьбіты з азартам дзюбамі разбівалі каробачкі пустазелля і наперабой выцягвалі зярняты ("Звязда", 1967, 24 лютага).

Параўн.: Крылатыя памочнікі хлебаробаў.

У сучаснай лінгвістыцы слоўнікі параўнанняў, перыфраз і іншыя лексікаграфічныя выданні, дзе апісваюцца разнастайныя "фігуры перасэнсавання", аб'ядноўваюць у групу слоўнікаў вобразна-выяўленчых сродкаў.

5. Слоўнікі афарызмаў – тып інвентарызацыйных ідыёмных слоўнікаў, у якіх зафіксаваны кароткія арыгінальныя выслоўі закончанага зместу і дасканалай формы.

Афарыстычныя выслоўі беларускіх пісьменнікаў розных гістарычных перыядаў сабраны і сістэматызаваны ў слоўніку "Крылатыя словы і афарызмы" Ф. Янкоўскага (Мінск, 1960; 220 сл. арт.), выданні "Майстры кажуць... Беларускія літаратурныя афарыстычныя выслоўі" А. Леванюк (Брэст, 2010; каля 150 сл. арт.) і працы "Афарыстычныя выслоўі беларускіх пісьменнікаў" Н. Гаўрош, Н. Нямковіч (Мінск, 2012; каля 3,6 тыс. сл. арт.).

У слоўніку Ф. Янкоўскага да асобных афарызмаў прыводзіцца экстралінгвістычная інфармацыя і каментарыі.

68. Жартачкі – ён так мудра піша, што тлумачэнне патрабуецца.

Выраз з апавядання Змітрака Бядулі "Тры крыжыкі" (1926).

Герой апавядання "Тры крыжыкі" селянін Янка Гарбач – непісьменны. Калі трэба распісацца, то ён, "як сахою па раллі. Водзіць пяром па паперы", ставячы тры крыжыкі. Пісьменныя людзі ставяць пры гэтых крыжыках яго імя і прозвішча. Так даецца тлумачэнне да іх, каб у канцылярыі ведалі, што гэтыя крыжыкі абазначаюць "Янка Гарбач".

Янка вельмі гардзіцца тлумачэннем пісьменных: жартачкі – ён так мудра піша, што тлумачэнне патрабуецца.

Змітрок Бядуля, Збор твораў,
т. 1, Мінск, 1951, с. 193.

У выданнях А. Леванюк, Н. Гаўрош і Н. Нямковіч выслоўі падаюцца па розных тэматычных групах ("Пра прыроду, грамадства, Сусвет", "Пра чалавека, чалавечыя якасці", "Пра мінуўшчыну і будучыню"). Пасля кожнага афарызма ўказваецца аўтар і крыніца.

Пакуль са мною плачуць вочы друга
Над цяжкай стратай – ёсць яшчэ жыццё.

Караткевіч У. Крумкачы (46, с. 21).

Крылатыя выразы беларускай мовы, якія паходзяць з антычных, заходнееўрапейскіх, амерыканскіх і ўсходнеславянскіх літаратурных і фальклорных крыніц, прыводзяцца ў працах "Крылатыя выразы ў беларускай мове: тлумачальны слоўнік" пад рэдакцыяй Я. Іванова і С. Івановай (у 2 ч.; Магілёў, 2004 – 2006; каля 450 сл. арт.), "Крылатыя афарызмы ў беларускай мове: тлумачальны слоўнік" Я. Іванова (Магілёў, 2011; каля 160 сл. арт.) і інш.

III. У сувязі з імклівым развіццём камп'ютарнай тэхнікі ў апошнія дзесяцігоддзі актыўна распрацоўваюцца машынныя тэхналогіі ўкладання традыцыйных слоўнікаў, а таксама ствараюцца электронныя слоўнікі, якія распаўсюджваюцца на кампакт-дысках або размяшчаюцца на серверах камп'ютарных сетак [2, с. 44 – 45; 4, с. 9 – 10].

Электронны слоўнік – аўтаматызаваная сістэма інтэлектуальнага прызначэння з сабранымі і пэўным чынам упарадкаванымі лінгвістычнымі звесткамі. Электронны слоўнік унутрана пабудаваны як база дадзеных са слоўнікавымі артыкуламі [1]. Выкарыстанне камп'ютарнага інструментарыю дазваляе хутка знаходзіць патрэбнае слова з улікам марфалогіі і магчымасці пошуку словазлучэнняў [3, с. 44 – 45].

Стварэнне электронных слоўнікаў абумоўлена дзвюма прычынамі: 1) пошукам шляхоў павышэння выніковасці працы лексікографа і перакладчыка; 2) хуткім ростам магчымасцей камп'ютарнай тэхнікі [5].

Існуюць анлайн-слоўнікі, праграмныя слоўнікі, анлайн-праграмныя слоўнікі.

Анлайн-слоўнікі – від электронных слоўнікаў, якія працуюць на ўмовах інтэрнэт-доступу. Да гэтага тыпу адносяцца Вікіслоўнік, Lingvo, Мульцітран, FreeOnlineTranslators і інш. Электронны "Тлумачальны слоўнік беларускай мовы" (http://rv-blr.com/) змяшчае каля 37 тыс. сл. арт. і працуе ў двух функцыянальных рэжымах: 1) тлумачэнне значэння слова з рэестра; 2) тлумачэнне слова, ужытага ў кантэксце.

У інтэрнэт-прасторы размешчаны электронны корпус беларускай мовы (http://bnkorpus.info/), многія дыялектныя, арфаграфічныя, ана-

мастычныя, граматычныя, фразеалагічныя, перакладныя слоўнікі беларускай мовы, а таксама слоўнікі лексічных формаў, вобразных сродкаў, гістарычны, этымалагічны слоўнікі і інш.

Праграмныя слоўнікі – лексікаграфічны прадукт, які інсталюецца на персанальны камп'ютар або захоўваецца ў выглядзе спецыяльнага электроннага дакумента.

Да такіх слоўнікаў належаць праект "ArfaBel" – беларускі праграмны слоўнік для праверкі арфаграфіі беларускамоўных тэкстаў, электронны слоўнік "Назвы азёр Беларусі" С. Шахоўскай (Мінск, 2014), "Электронны двухмоўны слоўнік метафар псіхалагічнай сферы чалавека" В. Шыманскай (2016), слоўнікі "Канкарданс Кандрата Крапівы" (Мінск, 2011) і "Канкарданс беларускай мовы XIX стагоддзя" (Мінск, 2015) Н. Сянкевіч і іншыя працы, прызначаныя для распаўсюджвання праз сетку інтэрнэт або на кампакт-дысках.

Анлайн-праграмныя слоўнікі – спецыялізаваныя праграмы машыннага перакладу слоў, словазлучэнняў, сказаў, html-старонак, ini-файлаў праграм, праграмных інтэрфейсаў. Найбольш запатрабаваны слоўнік гэтага тыпу – "Белазар". Да яго асноўных магчымасцей адносяцца: пераклад тэксту, аўтаматызацыя працэсу перакладу (чарнавы пераклад з варыянтамі перакладу некаторых слоў і з абазначанымі неперакладзенымі словамі і словамі з магчымымі памылкамі), падтрымка альтэрнатыўнай графікі, аўтаматычнае пераключэнне раскладкі клавіятуры і арфаграфічны аналізатар беларускага тэксту.

Абавязковая частка любога электроннага слоўніка – рэестр.

Рэестр можа быць уваходам у сістэму семантычнага апісання (базу інфармацыі) або адзіным кампанентам лінгвістычнай базы. Рэестры сістэм машыннага перакладу ўтрымліваюць лексічныя адзінкі з граматычнымі і семантычнымі характарыстыкамі, неабходнымі для здзяйснення лексічнага і сінтаксічнага аналізу тэксту. Такія сістэмы павінны ўключаць апісанні значэнняў, сінтаксічных і семантычных правіл. Рэестр аднамоўнага аўтаматычнага слоўніка тлумачальнага тыпу вызначаецца прынцыпамі, закладзенымі ў праект такога слоўніка.

Спіс літаратуры

1. **Беляева, Л. Н.** Современные терминологические базы данных: проблемы и перспективы / Л. Н. Беляева // Слово и словарь. Vocabulum et vocabularium : сб. научных трудов по лексикографии. – Харьков : Підручник НТУ "ХІП", 2011. – Вып. 12. – С. 32 – 36.
2. **Дзятко, Д. В.** Перыядызацыя гісторыі і перспектывы развіцця беларускай лексікаграфіі / Д. В. Дзятко // Беларуская мова і літаратура ў славянскім этнакультурным кантэксце : Матэр. II Рэсп. навук.-практ. канф. (Віцебск, 19 – 20 ліст. 2015 г.). – Віцебск, 2015. – С. 42 – 45.
3. **Кузьмина, Н. А.** Активные процессы в русском языке и коммуникации новейшего времени / Н. А. Кузьмина, Е. А. Абросимова. – М. : Флинта : Наука, 2013. – 256 с.
4. **Лесников, С. В.** Словарь русских словарей / С. В. Лесников. – М. : Азбуковник, 2002. – 328 с.
5. **Марфіна, Н. У.** Электронныя слоўнікі на ўроках беларускай мовы ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі / Н. У. Марфіна // Усходнеславянскія мовы ў сучаснай лексікаграфіі : зб. навук. арт. – Мінск : БДПУ, 2015. – С. 71 – 73.
6. **Шакун, Л. М.** Гісторыя беларускага мовазнаўства / Л. М. Шакун. – Мінск : Універсітэцкае, 1995. – 271 с.

Дзмітрый ДЗЯТКО,
кандыдат філалагічных навук.

Аўтар ахвяруе ганарар на развіццё часопіса.

Жывое слова

Алесь КАЎРУС

ЧЫТАЕМ, СЛУХАЕМ, ЗГАДВАЕМ РОДНАМОЎНАЕ

Працяг. Пачатак у №№ 7 – 11.

НАВАТВОРЫ: МНОСТВА І АДЗІН

Аглядкавасць

Сярод публікацый апошняга часу ў газеце "Літаратура і мастацтва", часопісе "Полымя", прысвечаных разгляду творчасці маладых пісьменнікаў, вылучаецца водгук Янкі Лайкова "Вечная адысея душы" на зборнік вершаў Галіны Сіўчанкі "Зоў Звычаю".

Паводле назірання Я. Лайкова, "неўтаймоўная словатворчасць" паэткі ўскладняе ўспрыманне вершаў: "Як і гамераўскаму Улісу, чытачу наканавана падарожнічаць ад адной выспы-верша да другой, штораз патрапляючы ў слоўныя пасткі, а, вызваліўшыся, імкнуцца да новых далягляда ў".

Разам з тым адгукант, сам паэт, прафесійна аналізуючы творы калегі, робіць асноўны вывад-ацэнку: "...перад намі – сапраўды яркая, самабытная паэтка, стваральніца арыгінальных вобразаў-знаходак, якая ў сваіх аўтарскіх вершах непадобная ні на кога і тым самым цікавая і запатрабаваная ўдумлівым чытачом" (ЛіМ. 28.09.18).

Такая адметная мова, з мноствам наватвораў, патрабуе ўдумлівага чытання. І, вядома, не толькі ў гэтым выпадку. Аўтарскія наватворы ўвогуле